# На стэндах—кнігі

Ля Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна — заўсёды шматлюдна. Сюды ідуць студэнты і рабочыя, сустрэнеш тут вучоных і настаўнікаў, інжынераў і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў. Але даўно не было так шматлюдна, як у гэты дзень. Усе гаварылі пра кнігі Балгарыі.

І гэта зразумела. Дэкада балгарскай культуры ў нашай рэспубліцы —сапраўднае свята.

— Я меў вялікае шчасце наведаць Балгарыю, — гаворыць беларускі паэт Міхась Калачынскі. — Як родных братоў, гасцінна і сардэчна сустракалі нас балгарскія сябры. Мы бясконца рады, што беларускае слова, беларуская песня гучаць на балгарскай мове, а беларускія чытачы з цікавасцю чытаюць кнігі нашых суседзяў.

— Наша дружба вялікая і моцная, як Балканы, — гаворыць у сваім выступленні вядомы балгарскі пісьменнік Ангел Тодараў. — З году ў год ёй расці і квітнець, бо дружба, як і песня, не ведае межаў і граніц.

Балгарскі госць шчыра дзякуе мінчанам за цёплую сустрэчу, гасціннасць, запрашае на выстаўку кнігі.

...Кнігі. Кнігі. Кнігі... Ангелу Тодараву задаюць пытанні, мінчане цікавяцца, распытваюць у госця пра любімых пісьменнікаў і паэтаў, над чым яны цяпер працуюць. Прыемна пісьменніку — у Беларусі добра ведаюць балгарскіх літаратараў, іх творы. Пісьменнік прывёў такую лічбу: цяпер у Балгарыі выдаецца 3.400 кніг у год агульным тыражом 38—40 мільёнаў экземпляраў.

На стэндах — выбраныя творы Івана Вазава, Хрыста Боцева, Хрыста Радзеўскага, Стаяна Даскалава... Кнігі паэзіі маладых... І ўсе яны выдадзены з любоўю, добра аформленыя.

А вось стэнды кніг рускай літаратуры на балгарскай мове. Максім Горкі і Міхаіл Шолахаў, Аляксей Талстой і Уладзімір Маякоўскі, іншыя кнігі савецкіх пісьменнікаў.

— А гэта, сябры, — гаворыць Ангел Тодараў, — кнігі беларускіх празаікаў і паэтаў.

На стэндзе — творы Янкі Купалы і Якуба Коласа, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Алеся Адамовіча, паэтычныя зборнікі Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка і Пімена Панчанкі.

...Ідуць у бібліятэку імя У. І. Леніна ўсё новыя і новыя людзі. Кожнаму хочацца пабываць на выстаўцы кнігі балгарскіх сяброў.

Я. КРУПЕНЬКА.